ШКОЛЬНАЯ ПРАГРАМА

**Л. Э. Сенкевіч, М. К. Грыцэнка, Н. А. Дабравольская**

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## 2 клас

***Тэставыя работы з правіламі і заданнямі***

Дапаможнік для вучняў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

Мінск
«Сэр-Віт»
2023

# Ад аўтараў

***Шаноўны другакласнік!***

Дапаможнік, які ты трымаеш у руках, створаны з мэтай спрыяць твайму далейшаму поспеху ў пазнанні і вывучэнні роднай мовы, мовы тваіх бацькоў, дзядоў, прадзедаў, спрыяць выпрацоўцы трывалых навыкаў граматнага пісьма, пашырэнню слоўнікавага запасу.

У дапаможніку прапануюцца практыкаванні і розныя заданні для адпрацоўкі арфаграфічных навыкаў, шмат матэрыялу для развіцця маўлення і пашырэння лексічнага запасу вучняў.

На пачатку кожнай тэмы прапануецца ўспомніць правілы, а потым папрактыкавацца ў іх прымяненні: растлумачыць правапіс, уставіць прапушчаныя літары, знайсці памылкі. Каб праверыць трываласць набытых ведаў, выконвай заданні ў прапанаваных тэстах.

Рэгулярна працуючы ў сшытку, ты зможаш правільна гаварыць па-беларуску, чым парадуеш настаўніка і сваіх бацькоў. Ты зразумееш, што родная мова прыгожая і мілагучная.

***Карыснай і цікавай працы табе на старонках дапаможніка!***

Настаўнік можа выкарыстоўваць дапаможнік не толькі на ўроках беларускай мовы, але і для правядзення розных заняткаў, на інтэграваных уроках пісьма і чытання.

Бацькі могуць выкарыстоўваць дапаможнік для праверкі і замацавання ведаў сваіх дзяцей, а таксама для ліквідацыі прабелаў у іх ведах.

# УСТУПНЫ КУРС

## Вывучаем беларускую мову

***Памятка!*** У беларускай мове гук [**і**] абазначаецца галоснай літарай ***і***, якая адрозніваецца ад такой жа літары ў рускай мове: ***І і.***

### *Папрактыкуйся.*

**1.** Прачытай тэкст. Падкрэслі літару ***і***.

Ігнатка скончыў першы клас. Гэта былі яго першыя канікулы, калі ўсё лета вольнае.

*С. Далідовіч.*

**2.** Літара згубілася. Устаў ***І*** або ***і***.

Дзед ..гнат люб..ў восеньск..м ранкам зайсц.. ў сад. Ён з ахвотаю паказваў ..рынцы чырвоныя яблык.., жоўтыя грушы.

***Памятка!*** Апостраф не літара, а надрадковы знак. Там, дзе ў слове стаіць апостраф, пры чытанні вымаўляецца гук [**й'**]. Апостраф раздзяляе **цвёрдыя зычныя і галосныя *е*, *ё*, *ю*, *я*, *і*.**

Пад волатам-дубам набрала груш Люба,
А Толя пад клёнам – кош поўны лімонаў.

*А. Зэкаў.*

Імёны дзяцей: ________________________________

______________________________________________

______________________________________________

Назвы фруктаў (садавіны): ______________________

______________________________________________

______________________________________________

***Правер сябе!***

## Тэст

**1.** Колькі літар у беларускім алфавіце? Адзнач «✓».

☐ [30]; ☐ [31]; ☐ [32]; ☐ [33].

**2.** Адзнач «✓», у якім радку словы запісаны ў алфавітным парадку.

☐ Таполя, асіна, ліпа, вольха, вяз.
☐ Бяроза, граб, дуб, клён, сасна.

**3.** Якіх літар няма ў беларускім алфавіце? Адзнач «✓».

☐ й, д; ☐ щ, и; ☐ ў, і; ☐ л, й, к.

**3.** Прачытай словы. Вызначы ў іх націскныя склады. Устаў літару ***е***, ***ё*** або ***я***.

| | | |
|---|---|---|
| В..лікі | м..стэчка | в..тры |
| паб..ліў | леб..дзі | б..рагі |
| кол..р | л..савік | кроп..лька |
| сн..жны | в..сёлка | в..с..лушка |
| ліп..нь | б..роза | сн..гір |
| с..стрычка | з..мля | в..снавы |
| пев..нь | вец..р | дз..нёчкі |

***Правер сябе!***

## Тэст

**1.** У якіх словах ***е***, ***ё*** стаіць пад націскам? Адзнач «✓».

- [ ] Возера;
- [ ] вясёлка;
- [ ] леташні;
- [ ] жнівень.

Башня (якая?) высокая, а калодзеж (________)
______________________
______________________.

*Словы-падказкі*: горкая, нізкі, кароткая, цёплае.

✶ Падкрэслі словы, якія называюць прыметы прадметаў.

**4.** Пастаў пытанні да выдзеленых слоў.

Над (________) **ціхімі** палямі ўстае (________) **залацістая** зара. (________) **Адзінокае** воблачка плыве па (________) **сінім** небе. Над галавою праззвінела (________) **пругкімі** крыламі чародка качак.

***Правер сябе!***

**Тэст**

**1.** Словы, якія называюць прыметы прадметаў, адказваюць на пытанні …

☐ Хто? Што? ☐ Якая? Якое? Якія? Які?

**2.** На якое пытанне адказваюць усе прапанаваныя словы?

Сонечная, дарослая, малая, залатая.

☐ На пытанні ***хто? што?***

☐ На пытанне ***якая?***

**3.** Адзнач «✓» радок слоў, якія называюць прыметы прадметаў.

☐ Зялёны, ранішні, шаўковы.

☐ Ластаўка, пішу, прыгожы.

**4.** У якім сказе няма слоў, якія называюць прыметы прадметаў? Адзнач «✓».

☐ У садку растуць дзьмухаўцы.

☐ Раніцай яны запальваюць свае жоўтыя сонейкі.

☐ Ноччу і перад дажджом кветкі сціскаюцца ў тугія пупышкі.

**5.** З прапанаваных складоў складзі словы, якія называюць прыметы прадметаў.

я, кі , **клей** – ____________ ча, е, ра, **га** – ____________

ны, **дух**, мя – ____________ сё, **вя**, лы – ____________

## Словы, якія называюць дзеянні прадметаў

***Памятка!*** Словы, якія называюць дзеянні прадметаў, адказваюць на пытанні ***што раблю? што робіш? што зраблю? што зробяць?*** і інш.: *спяваю, малюеш, закрычу, зацвітуць.*

### *Папрактыкуйся.*

**1.** Адгадай загадку. Якія словы падказалі табе адгадку?

Крылаў не маю, а хутка лятаю.
Сам мяне выпусціш, ды потым не зловіш.

✶ Падкрэслі словы, якія абазначаюць дзеянні прадмета.

✶ Вусна пастаў да іх пытанні.

**2.** Падкрэслі ў прыказках словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў.

- Работу словам не замяніш.
- Як папрацуеш, так і паясі.
- Праўду на базары не купіш.
- З чужой бяды не смейся.
- Сёння зробіш, заўтра як знойдзеш.

**3.** Пастаў пытанні да слоў – дзеянняў прадметаў.

На беразе маленькага ляснога возера (____________________) наладзілі канцэрт жабы. (____________________) Церушыў на іхнія галоўкі цёплы дождж ык.(____________________) Свяціла сонца. Весела было жабкам – вось яны і (____________________) спявалі. (*Паводле У. Караткевіча.*)

***Правер сябе!***

## Тэст

**1.** Што абазначаюць словы, якія адказваюць на пытанні ***што раблю? што робіш? што зраблю? што зробяць?***

☐ Прыметы прадметаў.
☐ Дзеянні прадметаў.
☐ Называюць прадметы.

**2.** Якія з гэтых слоў абазначаюць дзеянні прадметаў? Адзнач «✓».

☐ Вясёлы; ☐ вяселле; ☐ весяліліся.

**3.** Адзнач «✓», якія словы адказваюць на пытанне ***што зробяць***?

☐ Напішуць; ☐ чытала;
☐ гуляе; ☐ наступяць.

**4.** У якім радку запісаны толькі словы – дзеянні прадметаў?

☐ Скача, цячэ, ручай.
☐ Спе́е, квакае, нясе.
☐ Ходзіць, паліто, шуміць.

**5.** Колькі разоў паўтараецца гук [**р**] у словах, якія абазначаюць дзеянні прадметаў? Адзнач «✓».

Сам зрабіў я, сам прыбіў
ля акенца скрыначку.
Круп насыпаў, пакрышыў
хлебную скарыначку.

*М. Янчанка.*

☐ 3; ☐ 4; ☐ 5.

## Сказ. Афармленне сказа на пісьме

***Памятка!*** Сказ выражае закончаную думку. У кожным сказе пра штосьці паведамляецца. Першае слова ў сказе пішацца з вялікай літары. У канцы сказа ставіцца кропка (**.**), пытальнік (**?**) або клічнік (**!**).

### ***Папрактыкуйся.***

**1.** Збяры і запішы сказ.

Усю, барсук, пад, глыбока, зямлёй, спіць, зіму.

________________________________________

________________________________________

________________________________________

________________________________________

✶ Пра каго ідзе гаворка ў сказе? Падкрэслі гэта слова адной рыскай.

✶ Што пра яго гаворыцца? Падкрэслі слова дзвюма рыскамі.

# ЗМЕСТ


АД АЎТАРАЎ . . . . . . . . . . 3
УСТУПНЫ КУРС . . . . . . . . . . 4
Вывучаем беларускую мову . . . . . . . . . . 4
Гукі і літары . . . . . . . . . . 8
ГУКІ МОВЫ . . . . . . . . . . 12
Абазначэнне гукаў на пісьме літарамі . . . . . . . . . . 12
Беларускі алфавіт . . . . . . . . . . 15
Напісанне вялікай літары ў словах . . . . . . . . . . 18
Галосныя і зычныя гукі . . . . . . . . . . 23
Вымаўленне і правапіс слоў з ***ў*** . . . . . . . . . . 26
Склад. Падзел слоў на склады. Перанос слоў . . . . . . . . . . 30
Націск . . . . . . . . . . 33
Галосныя гукі [о], [э] – [а]. Правапіс слоў з літарамі ***о***, ***э*** – ***а*** . . . . . . . . . . 36
Правапіс слоў з літарамі ***е***, ***ё*** – ***я*** . . . . . . . . . . 39
Цвёрдыя і мяккія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме . . . 42
Зычныя гукі [д] – [дз’]. Іх абазначэнне на пісьме . . . . . . . . . . 45
Зычныя гукі [т] – [ц’]. Іх абазначэнне на пісьме . . . . . . . . . . 48
Зацвярдзелыя зычныя гукі. Правапіс слоў з імі . . . . . . . . . . 51
Парныя звонкія і глухія зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме . . . . . . . . . . 54
Падоўжаныя зычныя гукі. Іх абазначэнне на пісьме . . . . . . . . . . 58
Раздзяляльныя знакі – апостраф (’) і мяккі знак (***ь***) . . . . . . . . . . 61
СЛОВА . . . . . . . . . . 66
Значэнне слова . . . . . . . . . . 66
Словы, якія называюць прадметы . . . . . . . . . . 68
Прыназоўнік. Правапіс прыназоўнікаў . . . . . . . . . . 71
Словы, якія называюць прыметы прадметаў . . . . . . . . . . 74
Словы, якія называюць дзеянні прадметаў . . . . . . . . . . 78
Сказ. Афармленне сказа на пісьме . . . . . . . . . . 81
ТЭКСТ . . . . . . . . . . 85
ПАЎТАРЭННЕ . . . . . . . . . . 89
СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ . . . . . . . . . . 93